УДК 904.5(4)”653” DOI: 10.37445/adiu.2021.01.21

*В. А. Макоўская*

# ПРАБЛЕМНЫЯ ПЫТАННІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ВЫВУЧЭННЯ ДЗІЦЯЧАГА ПАХАВАЛЬНАГА ІНВЕНТАРУ СТАРАЖЫТНАЙ РУСІ (У КАНТЭКСЦЕ СІНХРОННЫХ ЕЎРАПЕЙСКІХ МОГІЛЬНІКАЎ)

*У дадзеным артыкуле робіцца спроба акрэсліць некаторыя праблемныя пытанні і актуальныя накірункі вывучэння інвентару дзіцячых пахаванняў у раннім Сярэднявеччы. Разглядаюцца такія аспекты як наяўнасць або адсутнасць інвентару ў дзіцячых пахаваннях, яго сацыяльнае, гендарнае, узроставае значэнні. У якасці прыкладаў і аналогій выкарыстоўваюцца дзіцячыя пахаванні Усходняй і Цэнтральнай Еўропы, а таксама з некаторых добра вывучаных тэрыторый Заходняй Еўропы.*

***Ключавыя словы:*** *археалогія дзяцінства, ранняе Сярэднявечча, Старажытная Русь, дзіцячыя пахаванні, пахавальны інвентар.*

Пахавальны інвентар з’яўляецца неад’емнай часткай пахавальнага абраду, характэрнага для пэўнай культуры. Наяўнасць або адсутнасць інвентара, набор рэчаў, якія клаліся ў пахаванне, звычайна вызначаны культурнай традыцыяй канкрэтных грамадстваў. Аднак даследчыкамі даўно заўважана, што набор пахавальнага інвентару, пры яго наяўнасці, карэлюе з полам і ўзростам нябожчыка (Алёкшин 1981, с. 4). Падабраны супольнасцю, ён дае нам уяўленне аб стаўленні лакальнай супольнасці да свайго памерлага чальца, яго месцы ў грамадстве. Гэтая інфармацыя асабліва актуальная ў дачыненні да дзяцей перыяду Старажытнай Русі, увага якім дагэтуль амаль не надавалася. Падрабязнае вывучэнне пахавальнага інвентару дзяцей можа даць адказ на пытанне, у якім узросце старажытнарускія дзеці станавіліся паўнапраўнай часткай супольнасці і якому біялагічнаму ўзросту адпавядалі дадзеныя змены. А таксама, ці існавалі ў культуры пэўныя ўзроставыя катэгорыі дзяцей і як гэта адлюстроўвалася ў інвентары іх пахаванняў. Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца ахарактарызаваць некаторыя праблемныя пытанні і асаблівасці дзіцячага пахавальнага інвентару Старажытнай Русі, акрэсліць перспектыўныя накірункі даследаванняў. Гаворка пойдзе пра такія крытэрыі як наяўнасць або адсутнасць інвентару ў дзіцячых пахаваннях, яго сацыяльнае, гендарнае і ўзроставае значэнні. Старажытнарускія пахаванні будуць разглядацца ў кантэксце сінхронных старажытнасцяў з тэрыторыі Усходняй, Цэнтральнай і некаторых тэрыторый Заходняй Еўропы, дзе археалогія дзяцінства знаходзіцца на даволі добрым узроўні развіцця і дзіцячыя пахаванні не раз станавіліся аб’ектам грунтоўнага крыніцазнаўчага аналізу. Нягледзячы на тое, што пад храналагічныя і тэрыятарыяльныя рамкі падпадаюць як пахаванні па абрадзе інгумацыі, так і крэмацыі, разглядацца пераважна будуць менавіта першыя. Гэта звязана з тым, што пакуль што маецца даволі мала антрапалагічных вызначэнняў дзіцячых пахаванняў па абрадзе крэмацыі. Хочацца адзначыць, што дадзеная публікацыя мае аглядны характар і не прэтэндуе на вычарпальны аналіз усяго існуючага матэрыялу па акрэсленай тэматыцы.

**Наяўнасць пахавальнага інвентару.** Даследчыкі розных культурных супольнасцяў перыяду ранняга Сярэднявечча часта адзначаюць беднасць інвентару дзіцячых пахаванняў. У дачыненні, напрыклад, да могільніка Саркела адзначана, што немаўлят да 1 года і дзяцей, старэйшых за 7 гадоў, рэдка калі хавалі з інвентаром (Артамонова 1963, с. 72). Пахаванні дзяцей да трохгадова-

© В. А. МАКОЎСКАЯ, 2021

га ўзросту ў раннесярэднявечнай Польшчы наогул не мелі інвентару (Gardeła, Duma 2013, p. 315), тое самае адзначаецца і для старажытнарускага сельскага некропаля Мініна II (Макаров, Зайцева 2007, с. 171). На раннесярэднявечных помніках Літвы і Латвіі пахаванні індывідаў ва ўзросце 12—20 гадоў вызначаны як найбольш бедныя (Kurila 2007, p. 116; Vilka 2013, p. 124). Сярод безінвентарных латгальскіх пахаванняў X—XIII стст. 60 % складаюць дзіцячыя (Радиньш 2001, с. 71). У вышэйадзначаных выпадках даследчыкі звязваюць беднасць ці адсутнасць інвентара з тым, што да трох год чалавек яшчэ не меў рэчаў у сваёй уласнасці, а з, прыкладна, дванаццаці гадоў пачынаў клапаціцца пра сябе сам і, нібыта, не паспяваў яшчэ прыдбаць вялікай колькасці рэчаў. Варта адзначыць, што гэтыя версіі з'яўляюцца даволі спрэчнымі ў дачыненні да малых дзяцей. Так, зыходзячы з падобнага тлумачэння, наўрад ці пяцігадовае дзіця магло прыдбаць больш уласных рэчаў, чым трохгадовае. І «працаваць» гэтыя версіі могуць толькі ў тым выпадку, калі мы прымаем дапушчэнне, што пахавальны інвентар з'яўляўся ўласнасцю пахаванага, што не даказана (Смирнов 1997, с. 74; Härke 2014, p. 46, Kurasiński 2004, s. 137). Асабліва дзіўным падаецца такое сцверджанне ў дачыненні, напрыклад, да пахаванняў маленькіх дзяцей са зброяй, гаворка пра якія пойдзе ніжэй. Як ужо адзначалася, малаінвентарныя або безінвентарныя дзіцячыя пахаванні не з'яўляюцца культурнай асаблівасцю, яны агулам характэрныя для розных культур разглядаемага перыяду. М. В. Харужая, на маю думку, прыводзіць больш верагоднае тлумачэнне адсутнасці побытавых рэчаў у пахаваннях дзяцей да 5—6 гадоў аланскага раннесярэднявечнага грамадства: нібыта дзеці да адзначанага ўзросту яшчэ не навучыліся карыстацца падобнымі рэчамі і таму ў пахаваннях яны ім не патрэбныя (Хоружая 2015, с. 257). Такім чынам у пахаваннях маленькіх дзяцей найбольш верагодна сустрэць некаторыя прадметы ўпрыгажэнняў, якія могуць пасаваць да дадзенага ўзросту. Аднак, як бы падобная з'ява не тлумачылася, яна дакладна сведчыць пра тое, што ў пэўных грамадствах узрост каля трох, дванаццаці або сямі гадоў з'яўляўся пэўнай мяжой, якая мела сацыяльнае значэнне. У цэлым, тлумачэнне беднасці пахаванняў маленькіх дзяцей можа быць прымальным для не элітарнага саслоўя, у той час, як будзе бачна ніжэй, у эліты грамадства пахавальны абрад і інвентар мелі куды больш сімвалічнае значэнне, чым практычнае.

**Інвентар як сацыяльны маркер. Дзіцячыя пахаванні са зброяй.** Пра тое, што інвентар з'яўляўся сацыяльным маркерам, дакладна кажуць нам знаходкі з «элітарных» пахаванняў дзяцей. Кажучы пра сацыяльную археалогію нельга не пагадзіцца з чэшскай даследчыцай Н. Прафантавай, якая адзначыла, што археалагічнымі метадамі пакуль надзейна магчыма выявіць толькі адну сацыяльную групу — «магутных і багатых» (Profantová 2016a, p. 12). Звычайна да такіх пахаванняў адносяць у раннім Сярэднявеччы пахаванні мужчын са статуснай зброяй і вялікай колькасцю імпартных рэчаў, і пахаванні жанчын з вялікай колькасцю ўпрыгажэнняў з каштоўных металаў. Менавіта пахаванні дзяцей са зброяй, раней за астатнія, звярнулі на сябе ўвагу даследчыкаў як даволі рэдкая і цікавая з'ява (Михайлов 2010, с. 53). Варта, аднак, звярнуць увагу, што колькасць дзіцячых пахаванняў са зброяй вагаецца ў залежнасці ад пахавальных традыцый канкрэтных супольнасцяў. Так, на некаторых балцкіх і прыбалтыйска-фінскіх тэрыторыях (у прыватнасці, на тэрыторыі сучасных Літвы і Латвіі) у раннім Сярэднявеччы ў пахаваннях сустракаецца значна большая колькасць зброі, чым на славянскіх тэрыторыях. Такая ж з'ява характэрная і для дзіцячых пахаванняў, у сувязі з чым мае сэнс разгледзець гэтыя тэрыторыі паасобку.

На тэрыторыі Латвіі ў земгалаў, латгалаў і ліваў назіраліся крыху розныя асаблівасці змяшчэння зброі ў пахаванні дзяцей, аднак у цэлым можна казаць, што зброя ў дзіцячых пахаваннях на тэрыторыі Латвіі ранняга Сярэднявечча не з'яўлялася нечым звышнатуральным. Так, сярод земгалаў яшчэ ва ўзросце 1—6 гадоў дзецям маглі класці ў пахаванні баявыя нажы і сякеры. У ліваў сякеры, коп'і і рыштунак каня змяшчалі ў пахаванні хлопчыкаў узросту 6—12 гадоў. У той час як у пахаваннях латгалаў нажы, сякеры і коп'і з'яўляліся толькі пасля дасягнення ўзросту 9—12 гадоў, пры гэтым, для перыяду X—XIII стст., з прадметаў узбраення ў пахаваннях хлопчыкаў найчасцей сустракаліся сякеры (Радиньш 2001, с. 112; Vilka 2013, p. 123—124).

У культуры ўсходнелітоўскіх курганоў, дзе зброя даволі часта сустракалася ў мужчынскіх пахаваннях, у дзіцячыя пахаванні зброю клалі радзей. Сярод 46, прыведзеных у артыкуле Л. Курылы, адзіночных пахаванняў дзяцей да дванаццаці год прадметы ўзбраення сустракаюцца толькі ў шасці выпадках. У адным пахаванні быў знойдзены наканечнік кап'я, у чатырох — сякера, і ў адным пахаванні разам кап'ё і сякера. І сякеры, і коп'і, сустракаліся ў дзяцей узростам ад двух—трох гадоў. У моладзі 12—20 год значна менш інвентару ў пахаваннях, чым у дзяцей. У гэтай узроставай групе знойдзена ўсяго адна сякера — у пахаванні маладо-

га мужчыны 16—20 год (Kurila 2007, p. 106, 110). Л. Курыла выказвае думку, што да 18—20 год падлеткі і маладыя мужчыны яшчэ не трактаваліся супольнасцю як паўнавартасныя ваяры (2007, p. 111). На карысць гэтай думкі можа сведчыць і тое, што ў пахаваннях індывідаў да 20 гадоў не было знойдзена ніводнага мяча.

Адразу варта сказаць, што мы не ведаем знаходак мячоў з дзіцячых пахаванняў на славянскіх тэрыторыях, як і знаходак засцерагальнага ўзбраення, або поўнага камплекта ўзбраення. Звычайна дзецям клалі нейкі адзін з элементаў зброі (Profantová 2016a, p. 7).

Т. Курасіньскі налічыў 22 інгумацыі дзяцей са зброяй у Польшчы, што датуюцца XI—XII стст. (Kurasiński 2009, s. 213—217). У Чэхіі пахаванні дзяцей з прадметамі ўзбраення фіксюцца ў больш ранні перыяд — другая палова IX — першая палова X стст. (Profantová 2016b, s. 252). З некаторых добра вывучаных і апублікаваных старажытнарускіх некропаляў мне таксама атрымалася сабраць пэўную інфармацыю аб пахаваннях дзяцей са зброяй. Ва ўсіх выпадках падобныя пахаванні фіксуюцца на могільніках, дзе знойдены элітарныя мужчынскія і жаночыя пахаванні. Пры гэтым на падобных могільніках у Чэхіі дзеці, пахаваныя з багатым інвентаром, могуць складаць даволі значны працэнт — да 50 %. Але статыстыка паказвае, што нават сярод элітарных дзіцячых пахаванняў зброя ў якасці інвентара сустракалася дастаткова рэдка (Profantová 2016a, p. 8, 11).

На тэрыторыі Старажытнай Русі, сярод усіх відаў зброі, менавіта сякеры найчасцей клалі ў пахаванні дзецям. Сякера была знойдзена ў камерным пахаванні хлопчыка 6—8 год у Кіеўскім некропалі (пахаванне 110), хлопчыка-падлетка з камернага пахавання 61.1 у Шаставіцы, хлопчыка з камернага пахавання ў Залахтаўі (курган 194), хлопчыкаў 8—9 і 11—12 год з камерных пахаванняў 4 і 5 Пскоўскага некропаля, дзіцячай (?) крэмацыі на могільніку ля в. Клонаў на Чарнігаўшчыне, 4 баявыя сякеры паходзяць з магіл падлеткаў і моладзі 12—19 гадоў могільніка Мікольскае III (Макаров 1989, с. 77; Ивакин 2011, с. 32; Михайлов 2010, с. 154; 2016, с. 232—233; Хоружая 2015, с. 215). Паводле Т. Курасіньскага, у Польшчы сякеры выступаюць у 5 выпадках з 22. Яны сустракаюцца ў пахаваннях дзяцей, пачынаючы з пяцігадовага ўзросту, і размяшчаюцца, часцей за ўсё, у нагах (з правага або левага боку), што адпавядае звычайнаму месцу сякеры ў пахаванні дарослага чалавека (Kurasiński 2009, s. 223, 226). На тэрыторыі Чэхіі пахаванні дзяцей з баявымі сякерамі былі зафіксаваныя ў 4 могільніках. Яны знаходзіліся ў магілах дзяцей, пачынаючы з самага ранняга ўзросту (Profantová 2016a, p. 7).

Найчасцей у раннесярэднявечнай Польшчы ў дзіцячых пахаваннях сустракаюцца наканечнікі стрэлаў — 10 выпадкаў. Пахаванні дзяцей са стрэламі не маюць прывязкі да пэўнага ўзросту (узрост пахаваных вызначаны як infans I, так і infans II), а наканечнікі стрэлаў не маюць канкрэтнага месца ў пахаванні (Kurasiński 2004, s. 134; 2009, s. 213—217; Drozd 2008, s. 55). Сярод старажытнарускіх пахаванняў наканечнік стралы паходзіць з камернай магілы Пскоўскага некропаля з пахавання хлопчыка 11—12 год (пахаванне 5) (Михайлов 2016, с. 233). Вядомыя таксама два выпадкі знаходжання стрэл у дзіцячых крэмацыях Гнёздава (Поль 6, Поль 18; Фетисов 2004, с. 94). Варта сказаць, што стрэлы не ва ўсіх выпадках маркіруюць сацыяльнае становішча пахаванага дзіцяці, часта даследчыкі трактуюць такія знаходкі як абярэгі. Асабліва гэта датычыцца выпадкаў безінвентарных або малаінвентарных пахаванняў. На падставе дадзеных этнаграфіі і пісьмовых крыніц, вострыя жалезныя прадметы, як страла або нож, у падобных пахаваннях звязваюць з абярэгамі як памерлых дзяцей, так і жывых членаў супольнасці, ад злых духаў (Фетисов 2004, с. 92; Kurasiński 2004, s. 138).

У двух выпадках на тэрыторыі Польшчы зафіксаваныя наканечнікі коп'яў і дроцікаў. Невялікі наканечнік дроціка (даўжынёй каля 9 см) быў знойдзены ў пахаванні дзіцяці 7—10 гадоў. Вядома таксама знаходка наканечніка кап'я і баявога нажа ў пахаванні хлопчыка 1—7 гадоў. Кап'ё або дроцік размяшчаліся збоку ад пахаванага, наканечнікам да галавы, або да ног, нож — у раёне таза (Kurasiński 2014, s. 189). Баявыя нажы вядомыя таксама з пахаванняў дзяцей 1—13 гадоў у чатырох чэшскіх могільніках (Profantová 2016a, p. 7). Гэты від зброі ў дзіцячых пахаваннях быў найменш распаўсюджаным. Магчыма, што баявыя нажы ў дзіцячых пахаваннях маглі з'яўляцца сімвалічнай заменай мяча (?).

Сярод дзіцячых пахаванняў з элементамі ўзбраення або рыштунку вершніка ў Чэхіі другой паловы IX — другой паловы X стст. найчасцей сустракаюцца шпоры (Profantová 2016b, s. 252).

Такім чынам можна казаць, што ў цэлым зброя ў дзіцячых пахаваннях ранняга Сярэднявечча Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, за выключэннем пэўных тэрыторый, з'яўляецца вельмі рэдкім відам інвентара. Прадметы ўзбраення маглі змяшчацца ў пахаванні дзяцей любога ўзросту: як падлеткаў, так і зусім маленькіх. Але, варта заўважыць, што для Старажытнарускіх пахаванняў ніжняя ўзроставая мяжа складае 6 год, што вышэй

за суседнія славянскія тэрыторыі. З прадметаў узбраення ў дзіцячых пахаваннях ранняга Сярэднявечча знаходзяць сякеры, стрэлы, коп'і і дроцікі, радзей — баявыя нажы, з рыштунку вершніка — шпоры. Варта заўважыць, што амаль усе пахаванні дзяцей са зброяй паходзяць з элітарных гарадскіх або сельскіх некропаляў. Большасць пахаванняў падобнага тыпу на тэрыторыі Старажытнай Русі здзейсненыя паводле камернага абраду. Кажучы пра дзіцячыя пахаванні са зброяй варта адзначыць, што ў шэрагу выпадкаў інвентар адлюстроўваў не ўзрост і статус дзіцяці, колькі вагу яго сям'і ў грамадстве. Гэта падцвярджаюць знаходкі прадметаў узбраення ў пахаваннях дзяцей узросту infans I, калі пахаваныя дакладна не маглі выкарыстоўваць дадзеныя прадметы пры жыцці. Пахаванні дзяцей са зброяй выразна ілюструюць сцверджанне А. А. Фяцісава, што не род заняткаў, а менавіта месца, якое займае індывід у сацыяльнай канцэпцыі грамадства, вызначаюць прысутнасць зброі ў пахаванні (Фетисов 2004, с. 89).

Датычна дзіцячых пахаванняў са зброяй узнікае некалькі праблемных пытанняў. У прыватнасці, ужо было заўважана, што большасць пахаванняў дзяцей са зброяй на тэрыторыі Старажытнай Русі паходзяць з элітарных могільнікаў і часта здзейсненыя паводле камернага абраду. Пры гэтым, падобныя пахаванні зафіксаваныя далёка не на кожным старажытнарускім элітарным або «дружынным» некропалі: недзе дзяцей хавалі паводле камернага абраду, але без зброі, недзе для дзяцей наогул не было традыцыі элітарных пахаванняў, як, напрыклад, у Гнёздава (Жарнов 1998, с. 109; Пушкина 2015, с. 20). На маю думку, даволі перспектыўнай з'яўляецца праца па зборы і картаграфаванні падобных пахаванняў з нанясеннем іх на карту старажытнарускіх некропаляў і ўвядзеннем такіх асобных пераменных як храналогія пахавання, ўзрост дзяцей і віды зброі. Улічваючы, што зброя з'яўлялася сацыяльным маркерам, такая праца дазволіла бы атрымаць інфармацыю аб тым, у які час, у якіх грамадскіх цэнтрах і ў якім узросце ў пахаванні дзяцей эліты змяшчаліся прадметы ўзбраення, і што гэта былі за віды ўзбраення. Магчыма, дадзеная праца дазволіла бы праліць святло на культурнае значэнне падобнай з'явы.

Пры гэтым, пры вызначэнні статуса пахаванага дзіцяці варта ўлічваць, што часам дзіцячыя пахаванні са зброяй спалучаюцца з элітарным пахавальным абрадам, часам з шэраговым, а часам і з дэвіянтным. Такім чынам пры вызначэннях варта ўлічваць усе фактары, не толькі наяўнасць зброі, аднак і яе від і параметры, размяшчэнне ў пахаванні, а таксама пахавальны абрад.

**Інвентар як гендарны маркер. Праблемныя выпадкі ў інтэрпрэтацыях дзіцячых пахаванняў.** Антраполагі адзначаюць, што вызначэнне полавай прыналежнасці ў дзіцячых пахаваннях па костных парэштках выклікае вялікія складанасці і, часта, амаль немагчымае (Lewis 2011, p. 5). Гэта звязана перадусім з неразвітасцю полавых прыкмет у шкілетах маленькіх дзяцей, а таксама часам з крохкасцю дзіцячых костак, у выніку якой яны значна больш схільныя да разбурэння ў глебе і, звычайна, знаходзяцца ў горшым стане захаванасці, чым шкілеты дарослых людзей. На падставе костных парэшткаў часта можна пераблытаць пахаванне падлетка з пахаваннем старога чалавека (Михайлов 2010, с. 153). Дадзеную задачу на сённяшні дзень можна вырашыць з дапамогай аналізу ДНК, аднак гэта даволі дарагая працэдура, якая пакуль не атрымала шырокага распаўсюджання ў старажытнарускай археалогіі. Такім чынам, большасць полавых вызначэнняў дзіцячых пахаванняў праводзяцца менавіта па пахавальным інвентары. Часта падобныя вызначэнні з'яўляюцца вельмі спрэчнымі, бо, па-першае, на падставе аналізу інвентара мы можам казаць хутчэй аб гендары пахаванага, чым аб яго полавай прыналежнасці, а па-другое, дзіцячы інвентар далёка не заўсёды адназначна маркіруе гендар. Вышэй ужо адзначалася, што дзіцячыя пахаванні часта бываюць малаінвентарнымі або безінвентарнымі. Як адзначаюць даследчыкі пахавальнага абраду ранняга Сярэднявечча Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, у складзе інвентара дзіцячых пахаванняў найчасцей сустракаюцца нож і керамічны посуд (Kurasiński 2009, s. 230), што з'яўляюцца гендарна-нейтральнымі. Часта бывае і такое, што ў дзіцячым інвентары побач з тыпова мужчынскімі рэчамі сустракаюцца жаночыя ўпрыгажэнні або рэчы жаночага побыту. Асабліва гэта вылучаецца на прыкладзе дзіцячых пахаванняў са зброяй. Варта адзначыць, што такія віды ўпрыгажэнняў, як бранзалеты і пярсцёнкі, часта з'яўляюцца гендарна-нейтральнымі, у той час як увага будзе звернутая перадусім на рэчы, што звычайна маркіруюць жаночыя пахаванні — скроневыя колцы, пацеркі і падвескі ў выглядзе караляў.

Скроневыя колцы з дзіцячых пахаванняў са зброяй вядомыя з трох раннесярэднявечных могільнікаў на тэрыторыі Польшчы: Коньске (Свентакшыскае ваяводства), Чэканув (Мазавецкае ваяводства), Дзекановіцэ (Вялікапольскае ваяводства) (Końskie, Czekanów, Dziekanowice) — усяго 4 пахаванні. Там, дзе магчыма было вызначыць узрост пахаваных, выяўлена, што ў двух выпадках у магілах знаходзяцца парэшткі дзяцей узрос-

ту infans II, у адным — infans I. У могільніку Коньске ў двух пахаваннях у складзе інвентара з прадметаў зброі былі сякерка-чакан і наканечнік дроціка, у абодвух выпадках скроневыя колцы размяшчаліся каля скроняў дзяцей. У могільніку Чэканув скроневае колца знаходзілася ў вобласці кісці дзіцяці і, верагодна, магло быць выкарыстана ў якасці пярсцёнка. З прадметаў зброі (альбо хутчэй імітацыі зброі) ў дадзеным пахаванні выяўлены каменны наканечнік стралы. Падобны характар у плане прадметаў, імітуючых зброю, мае і пахаванне з могільніка Дзекановіцэ, дзе скроневае колца ўваходзіла у склад караляў і спалучалася з каменнай куляй ад рагаткі (?) (Drozd 2008, s. 55; Kurasiński 2009, s. 213—215).

Пацеркі таксама сустракаюцца у дзіцячых пахаваннях са зброяй. Напрыклад, у могільніках Псары (Psary) (Лодзінскае ваяводства) і Дзекановіцэ на тэрыторыі Польшчы і ў могільніку Саркел (Белая вежа) на р. Дон. Узрост 2-х вызначаных пахаваных прыпадае на infans I. У могільніку Псары кавалак пацеркі (?) спалучаецца ў інвентары з наканечнікам стралы, у Дзекановіцах — з каменным наканечнікам стралы, у Саркеле — з мініяцюрнай сякеркай. Пры гэтым, калі ў Саркеле у пахаванні дзіцяці знойдзены дзве пацеркі, то ў Дзекановіцах пацеркі складаюць каралі з сямі штук (Артамонова 1963, с. 113; Drozd 2008, s. 55; Kurasiński 2009, s. 214).

Да дзіцячых пахаванняў са зброяй і, нехарактэрнымі для мужчынскага інвентару, каралямі і падвескамі варта аднесці пахаванне 110 (хлопчык 6—8 год) з сякерай у якасці зброі, дзьвюма срэбнымі падвескамі-дырхемамі і вялікай колькасцю ракавінак Unio, з адтулінамі для падвешвання, у якасці ўпрыгажэнняў (Ивакин 2011, с. 32). Вельмі цікавым у гэтым кантэксце з'яўляецца і пахаванне хлопчыка Эпохі вікінгаў, узростам каля 12 год, знойдзенае ля в. Баланкейл (Balankeil) на Паўночным узбярэжжы Шатландыі. Сярод багатага інвентару пахавання, побач з прадметамі ўзбраення (мячом тыпу H, наканечнікам кап'я тыпу K [1], умбонам ад шчыта), знаходзіліся таксама іголльніца з арганічнага матэрыялу з трыма металічнымі іголкамі, і тры пацеркі, знойдзеныя ў раёне шыі: дзьве бурштынавыя і адна шкляная вочкавая. Пахаванне датуюць сярэдзінай — другой паловай IX ст. (Batey, Paterson 2012, p. 654—655). Варта адзначыць, што меч у дзіцячым пахаванні з'яўляецца ўнікальнай знаходкай. Спалучэнне прафесійнага вайсковага рыштунку з, падавалася бы, тыповымі жаночымі рэчамі магло падкрэсліваць нясталасць пахаванага хлопца.

Як можна заўважыць, у некаторых выпадках (у прыватнасці, калі гаворка ідзе пра малых дзяцей) падобнае спалучэнне інвентара значна ўскладняе вызначэнне гендара пахаванага. Польская даследчыца Аліцыя Дрозд-Ліпіньска выказвае думку, што ўпрыгажэнні могуць быць паказальнікам гендара толькі ў тым выпадку, калі яны знаходзяцца ў пахаваннях дарослых людзей і ў тых месцах на касцяку, дзе іх было прынята насіць (Drozd 2008, s. 56).

Такім чынам можна казаць, што, найбольш верагодна, ў большасці выпадкаў, жаночыя ўпрыгажэнні ў дзіцячых пахаваннях са зброяй з'яўляюцца маркерам дзіцячага статуса пахаванага, чым гендарным маркерам.

**Інвентар як узроставы маркер. Прадметы дзіцячай матэрыяльнай культуры ў пахаваннях.** Кажучы пра інвентар дзіцячых пахаванняў варта адзначыць асаблівасць, што адразу кідаецца ў вочы — мы амаль не сустракаем цацак у пахаваннях дзяцей. Асабліва гэта датычыцца дзіцячых пахаванняў з шэраговых сельскіх могільнікаў. У той час як у пахаваннях эліты можна адзначыць некаторыя прадметы, што маглі б з'яўляцца цацкамі, або належаць да дзіцячай матэрыяльнай культуры і маркіраваць узрост пахаванага.

Падобны характар маюць знаходкі мініяцюрных амулетаў-сякерак, што з'яўляюцца копіямі баявой зброі. На сённяшні дзень вядома 9 такіх знаходак у старажытнарускіх пахаваннях, 6 з якіх былі пакладзены ў магілы хлопчыкаў, пачынаючы ад 3—5 год (вызначэнне полу па суправаджаючым інвентары). Геаграфія знаходак амулетаў-сякерак даволі шырокая: паўднёвыя Скандынаўскія тэрыторыі, Польшча, басейны рэк Волга і Дон. Яны сустракаюцца на пасяленчых помніках і ў пахаваннях. Што датычыцца пахаванняў, то падобныя знаходкі часцей знаходзяць менавіта ў дзіцячых, аднак зрэдку яны сустракаюцца таксама ў мужчынскіх і жаночых. На сённяшні дзень падобныя знаходкі даследчыкі суадносяць з мужчынскай субкультурай (Лесман 2014, с. 71). Менавіта ў дзіцячых пахаваннях яны вядомыя пакуль толькі ў трох старажытнарускіх могільніках: Мікольскае III Валагодскай вобл., Саркел (Белая Вежа) Растоўскай вобл., Міцява Маскоўскай вобл. (Макаров 1992, с. 47; Kucypera 2010, s. 130). Вядома таксама знаходка амулета-сякеркі з пахавання хлопчыка 3—5 год з могільніка ў Дзекановіцэ пад Гнезна (Wrzesińska 2000, s. 149; Kurasiński 2009, s. 224). Варта адзначыць, што гэтыя рэчы не з'яўляліся звычайным упрыгажэннем, аднак часта мелі дрэўкі і сустракаліся ў пахаваннях у раёне ног або таза (Макаров 1992, с. 50). Знаходкі падобных мініяцюрных

1. Паводле тыпалогіі Я. Петэрсана.

сякерак у дзіцячых пахаваннях датуюцца пераважна другой паловай XI ст. (Макаров 1992, с. 43; Kurasiński 2009, s. 215). Усе адзначаныя могільнікі ўтрымліваюць вялікую колькасць пахаванняў з багатым інвентаром, прадметамі зброі і прадметамі, што адносяць да «дружыннай культуры». Пры гэтым пахаванні хлопчыкаў 1—11 год з амулетамі-сякеркамі не ўтрымліваюць сапраўдных прадметаў узбраення. Баявыя сякеры сустракаюцца толькі ў могільніку Мікольскае III у падлеткаў з 12 год. Аналізуючы генэзіс падобнай з'явы, Ю. М. Лесман прыводзіць у якасці аналогіі сінхронную традыцыю пахаванняў хлопчыкаў з бурштынавымі сякеркамі на востраве Готланд, і выводзіць з'яўленне мініяцюрных сякерак у дзіцячых пахаваннях ад жалезных мініяцюрных сякерак-цацак, што сустракаюцца ў слаях старажытнарускіх паселішчаў з X ст. (Лесман 2014, с. 77).

У якасці маркераў дзіцячага статусу К. А. Міхайлаў называе знаходкі костак-астрагалаў у пахаваннях хлопчыкаў (Михайлов 2010, с. 154). На тэрыторыі Старажытнай Русі вядомыя 6 падобных пахаванняў. 157 астрагалаў барана знойдзены ў пах. 110 (хлопчык 6—8 год) Кіеўскага некропаля, 2 астрагалы знойдзены ў пахаванні 61.1 хлопчыка-падлетка з могільніка Шаставіцы, 11 шт. — у дзіцячым пахаванні 38.4 гэтага ж некропаля, 6 шт. паходзяць з трупаспалення 4 у с. Клонаў побач з Чарнігавам, 6 шт. былі знойдзены ў пахаванні 45 (хлопчык 1—7 год) і 2 шт. у пахаванні 35 насыпу 17/10 могільніка Саркела (Артамонова 1963, с. 111, 120; Михайлов 2010, с. 154; Ивакин 2011, с. 32). Даследчык таксама адзначае, што знаходкі астрагалаў у хлапечых пахаваннях звязаны з качэўніцкімі ўплывамі, з'яўляюцца паўднёварускай асаблівасцю і не вядомыя паўночней Чарнігава (Михайлов 2010, с. 155). Знаходкі астрагалаў у дзіцячых пахаваннях, тым не менш, не ва ўсіх выпадках маркіруюць узрост пахаванага. Справа ў тым, што, напрыклад, у Кіеўскім некропалі вядомыя знаходкі астрагалаў з пахаванняў, што маглі належаць дарослым людзям. Так, пахаванне, знойдзенае на вуглу Міхайлаўскай плошчы ў 1984 г. атрадам пад кіраўніцтвам С. Кіліевіч і У. Харламава, дзе ў складзе інвентара знаходзіліся 16 астрагалаў, К. А. Міхайлавым аднесена да дзіцячых, у той час як у пазнейшай публікацыі У. Г. Івакіна яно пазначанае як пахаванне дарослага мужчыны (Михайлов 2010, с. 155; Ивакин 2011, с. 33). Астрагал знойдзены таксама ў пахаванні дружынніка з канём (пахаванне 108 па М. А. Каргеры), два астрагалы паходзяць з нявызначанага пахавання на Дзесяцінным завулку, даследаваным у 2008 г., і адзін з пахавання на Залатабрамскім праездзе 1984 г., два астрагалы паходзяць таксама з, меркавана, парнага трупаспалення (пахаванне 120 па Каргеры). Знаходкі астрагалаў-бабак вядомыя таксама з Чарнігаўскага кургана Чорная магіла (Ивакин 2011, с. 36, 39, 40; Пушкина 2015, с. 7, 14). Адносна астрагалаў, як паказальнікаў дакладна хлапечага пахавання, таксама ёсць сумневы. Справа ў тым, што вядома знаходка двух ці трох астрагалаў з багатага дзіцячага пахавання 2 у кургане 8 Кемскага некропаля. З іншага інвентару гэтага пахавання варта адзначыць шэсць скроневых колцаў, каралі з пацерак, лыжачку-амулет, падвескі ў выглядзе крыжа-цельніка, плоскага коніка з цыркульным арнаментам, манетападобную падвеску з ціснёнай выявай галавы барана, пяць касцяных падвесак-качачак, касцяны аднабаковы грэбень з футаралам, праселка, амулеты ў выглядзе іклаў жывёлаў, вастрыё з рухомым колцам, шкляны і бронзавы пярсцёнкі, глінянае яйка-пісанку і дзве ляпных пасудзіны (Макаров 1989, с. 79). Падобны інвентар хутчэй адпавядае жаночаму пахаванню, чым мужчынскаму. Такім чынам, астрагалы на тэрыторыі Старажытнай Русі маглі змяшчаць не толькі ў пахаванні хлопчыкаў, аднак яны могуць быць маркерам узросту пры ўліку іншага інвентару пахавання (напрыклад, выступаючы разам з іншымі маркернымі рэчамі, як у пахаванні 45 Саркела — сякерка-амулет і астрагалы). Падобны характар мае і знаходка чатырнаццаці канічных касцяных фішак для гульні, што знаходзіліся ў нагах узгаданага вышэй хлопчыка з Баланкейл. Аўтары артыкула адзначаюць, што элементы гульняў былі знойдзеныя яшчэ ў двух багатых мужчынскіх пахаваннях у ладдзях, размешчаных на Оркнейскіх выспах Шатланды (Batey, Paterson 2012, p. 654). У дадзеным выпадку гульні маркіравалі хутчэй высокі статус пахаванага, і паасобку не маглі выступаць у якасці паказальніка ўзросту.

Да прадметаў, што выступаюць пераважна ў дзіцячых пахаваннях (аднак таксама і ў жаночых), адносяцца гліняныя яйкі-пісанкі. На тэрыторыі Старажытнай Русі вядомыя чатыры дзіцячыя пахаванні з пісанкамі. Такая знаходка паходзіць з пахавання дзіцяці 6—12 месяцаў могільніка Мініна II (пахаване 22), пахаванні дзяцей 4—8 (курган 8 пахаванне 2) і 3—5 год (курган 37 пахаванне 2) з могільніка Мікольскае III, дзіцячага пахавання ў кургане 99 Гочаўскага могільніка (Макаров 1989, с. 77—78; Макаров, Зайцева 2007, с. 177). У інвентары пахавання з кургана 37 могільніка Мікольскае, акрамя гліннай пісанкі, знаходзіўся яшчэ і мініяцюрны амулет-сякерка. У той час як пахаванне з кургана 8 у Мікольскім III і пахаванне з Мініна II па інвентары можна аднесці да дзявочых. Такім чынам на старажытнарус-

кіх тэрыторыях пісанкі былі ўласцівыя, хутчэй за ўсё, для дзяцей абодвух палоў.

Пісанкі вядомыя і на тэрыторыі Польшчы, дзе яны сустракаюцца ў 13 пахаваннях з 11 раннесярэднявечных могільнікаў. З гэтых пахаванняў шэсць належаць дзецям, два — жанчынам і пяць непрыдатныя для вызначэння. Часцей за ўсё пахаванні дзяцей з пісанкамі або не маюць іншага інвентару, або ўтрымліваюць невялікую колькасць упрыгажэнняў, накшталт скроневых колцаў, пацерак, пярсцёнкаў, ці гендарна-нейтральных прадметаў як нажы і керамічны посуд (Wawrzeniuk 2004, s. 145, 148—149). Даследчыкі адзначаюць, што пісанкі сустракаліся ў пахаваннях дзяцей, пачынаючы з 6—9 месяцаў і найбольш былі характэрныя для непаўнагадовых дзяцей (Siemianowska 2008, p. 75; Gardeła, Duma 2013, s. 320). На тэрыторыі Старажытнай Русі пісанкі таксама сустракаюцца ў пахаваннях дзяцей узросту infans I.

Некаторыя даследчыкі таксама адзначаюць, што вельмі часта ў пахаваннях дзяцей знаходзяць металічныя бразготкі. У прыватнасці, Э. Крыстыянсэн адзначае бронзавыя бразготкі сярод рэчаў, тыповых для дзіцячых пахаванняў Скандынавіі Эпохі вікінгаў (Christiansen 2006, p. 40). Аднак, у дадзеным выпадку, не зусім зразумела, якога кшталту бразготкі даследчык меў на ўвазе, з-за адсутнасці апісання. Такая сітуацыя адзначаецца і для старажытнарускіх пахаванняў на могільніку Гнёздава, дзе для дзіцячых інгумацый у невялікіх падкурганных ямах найбольш характэрнымі прадметамі называюцца гліняныя сасуды і бронзавыя бразготкі, могільніка Саркела, а таксама такія звесткі маюцца адносна пахаванняў дзяцей ў раннесярэднявечных аланаў (Артамонова 1963, с. 72; Жарнов 1998, с. 108; Хоружая 2015, с. 264). Для тэрыторый беларускага Павілля, а таксама курганных могільнікаў у басейне р. Нёман (у тым ліку і на тэрыторыі сучаснай Літвы) падобную сітуацыю фіксуе К. П. Тышкевіч, які адзначае бразготкі як прадмет, характэрны для дзяўчынак і маладых дзяўчат (Tyszkiewicz 1868, s. 52). Відавочна, што бразготкі нельга адносіць да прадметаў, маркіруючых дзіцячыя пахаванні, бо вядома, што яны часта сустракаюцца і ў пахаваннях дарослых жанчын, і часам у мужчынскіх пахаваннях. Але, на маю думку, было б цікава параўнаць працэнт сустракаемасці бразготак у старажытнарускіх пахаваннях розных узростаў і полавай прыналежнасці.

Калі амулеты-сякеркі і астрагалы найчасцей выступаюць разам з мужчынскім інвентаром, а пісанкі і бразготкі з'яўляюцца гендарна-нейтральнымі, то варта адзначыць, што звесткі аб рэчах, што маркіравалі бы пахаванні дзяўчынак амаль адсутнічаюць. Даследчыкі адзначаюць, што па пахаваннях дзяўчынак маркеры ўзросту не заўважныя так відавочна, як па пахаваннях хлопчыкаў. Збольшага, інвентар дзяўчынкі не адрозніваецца ад інвентару дарослай жанчыны (Kurila 2007, p. 116; Михайлов 2010, с. 155). На падставе даследаванняў археолагаў з краін Балтыі вядомыя некаторыя рэчы з пахаванняў дзяўчынак, што маркіруюць не дзіцячы статус, а, наадварот, пераход у статус дарослых. У латгалаў у такой ролі выступаюць, напрыклад, металічныя ўпрыгажэнні галавы — галаўныя венчыкі. У рэдкіх выпадках яны могуць сустракацца ў дзяўчынак васьмігадовага ўзросту, аднак, у большасці, сустракаюцца ў пахаваннях 14—15-гадовых і з'яўляюцца ўпрыгажэннямі дарослых жанчын (Радиньш 2001, с. 112; Vilka 2013, p. 124). У ліваў такімі рэчамі былі упрыгажэнні на ланцужках. З'яўляючыся даволі каштоўнымі прадметамі жаночага касцюму, яны былі не толькі і не столькі паказнікамі ўзросту, колькі таксама высокага сацыяльнага статусу (Vilka 2013, p. 124). Можна казаць, што падрабязны аналіз і пошук артэфактаў, што маглі б маркіраваць пахаванні дзяўчынак, з'яўляецца перспектыўным накірункам будучых даследаванняў.

Можна заўважыць, што ні пра амулеты-сякеркі, ні пра астрагалы, ні пра пісанкі, нельга сцвярджаць, што іх змяшчалі толькі ў дзіцячыя пахаванні. Аднак працэнтныя суадносіны кажуць аб тым, што найчасцей гэтыя прадметы сустракаюцца менавіта ў пахаваннях дзяцей. Пры гэтым, варта звярнуць увагу на тое, што астрагалы і пісанкі сустракаюцца пераважна ў пахаваннях дзяцей да сямі год. Калі паасобку яны яшчэ не могуць быць адназначнымі маркерамі ўзросту, то калі ў пахаванні сустракаюцца некалькі падобных рознатыпных прадметаў — са значнай доляй верагоднасці можна казаць, што пахаванне належала дзіцяці. Варта адзначыць, што гэтыя рэчы перадусім фіксуюцца на элітарных гарадскіх або багатых сельскіх могільніках, у той час як вылучэнне маркерных дзіцячых рэчаў з шэраговых сельскіх некропаляў застаецца задачай на перспектыву.

Як ужо адзначалася, акрамя хіба астрагалаў, мы не сустракаем цацак або элементаў гульняў у пахаваннях дзяцей Стражытнай Русі. Знаходкі гліняных яек-пісанак маюць спрэчную інтэрпрэтацыю. Некаторыя даследчыкі лічаць іх цацкамі-бразготкамі, у той час як іншыя — магічным прадметам у славянскай культуры, што сімвалізаваў кола жыцця, рэінкарнацыю, сувязь з замагільным светам і таму змяшчаўся ў пахаванні заўчасна памерлых (Wawrzeniuk 2004, s. 144). Большасць цацак найбольш верагодна ра-

білася з арганічных матэрыялаў, што хутка разбураліся ў глебе. Аднак не вядомыя знаходкі такіх прадметаў і з тых могільнікаў, дзе дрэва захоўваецца адносна добра. У любым выпадку, рэдкае знаходжанне цацак у пахаваннях дзяцей, нават зусім маленькіх, можа казаць аб тым, што свет памерлага дзіцяці адрозніваўся ад свету жывога, і памерлае дзіця не мела патрэбы ў цацках пасля смерці. Таксама, варта разумець, што ў дзіцячых пахаваннях мы бачым успрынящце дарослымі смерці і патрэбаў дзіцяці.

## ЛІТАРАТУРА


Алёкшин, В. А. 1981. Погребальный обряд как археологический источник. *Краткие сообщения Института археологии*, 167, с. 3-8.

Артамонова, О. А. 1963. Могильник Саркела — Белой Вежи. *Материалы и исследования по археологии СССР*, 109, с. 26-209.

Жарнов, Ю. Э. 1998. Гнёздовские курганы с остатками трупоположения. В: Янин, В. Л. (ред.). *Историческая археология: Традиции и перспективы (к 80-летию со дня рождения Д. А. Авдусина)*. Москва: Памятники исторической мысли, с. 106-113.

Ивакин, В. Г. 2011. Киевские погребения X в. *Stratum plus*, 5, с. 243-286.

Лесман, Ю. М. 2014. Скандинавский компонент древнерусской культуры. *Stratum plus*, 5, с. 43-87.

Макаров, Н. А. 1989. Кемский некрополь в северном Белоозерье. *Краткие сообщения Института археологии*, 198, с. 75-83.

Макаров, Н. А. 1992. Древнерусские амулеты-топорики. *Российская археология*, 2, с. 41-56.

Макаров, Н. А., Зайцева, И. Е. 2007. Мининский археологический комплекс: погребальные памятники. В: Макаров, Н. А. (ред.). *Археология севернорусской деревни X—XIII веков: средневековые поселения и могильники на Кубенском озере*. I: Поселения и могильники. Москва: Наука, с. 130-184.

Михайлов, К. А. 2010. Детские погребения в некрополе первых древнерусских городов. *Археологические вести*, 16, с. 151-159.

Михайлов, К. А. 2016. *Элитарный погребальный обряд Древней Руси: камерные погребения IX — начала XI века*. Санкт-Петербург: Бранко.

Пушкина, Т. А. 2015. Раннегородские могильники Древней Руси IX—XI вв. (несколько общих наблюдений). В: Лабутина, И. К. (ред.). *Древнерусский некрополь Пскова X — начала XI века*. 1: Раннегородской некрополь древнего Пскова по материалам раскопов на территории Среднего города. Санкт-Петербург: Нестор-История, с. 5-25.

Радиньш, А. 2001. Погребальный обряд и инвентарь латгальских захоронений 10—13 вв. *Archaeologia Lituana*, 2, с. 65-118.

Смирнов, Ю. А. 1997. *Лабиринт: Морфология преднамеренного погребения. Исследование, тексты, словарь*. Москва: Восточная литература.

Фетисов, А. А. 2004. Функции стрел в погребальном инвентаре «дружинных курганов». *Российская археология*, 3, с. 89-98.

Хоружая, М. В. 2015. Детские погребения из катакомб Верхне-Салтовского археологического комплекса (попытка половозрастной и социальной интерпретации). *Древности 2014—2015. Харьковский историко-археологический ежегодник*, 13, с. 257-275.

Batey, C., Paterson, C. 2012. A Viking burial at Balnakeil, Sutherland. *Nothern World*, 58, p. 631-659.

Christiansen, E. 2006. *The Norsemen in the Viking Age*. Malden; Oxford; Carlton: Blackwell Publishing.

Drozd, A. 2008. Ozdoby kobiece we wczesnośredniowiecznych grobach z bronią — wyposażenie czy dar? *Acta archaeologica Lodziensia*, 54, s. 51-59.

Gardeła, L., Duma, P. 2013. Untimely death: atypical burials of children in early and late medieval Poland. *World Archaeology*, 45, 2, p. 314-332.

Härke, H. 2014. Grave goods in early medieval burials: messages and meanings. *Mortality*, 19, 1, p. 41-60.

Kucypera, P., Pranke, P., Wadył, S. 2010. Wczesnośredniowieczne miniaturowe toporki metalowe z Europy Środkowo-Wschodniej i Północnej. Korpus zabytków. In: Kucypera, P., Wadył, S. (eds.). *Życie codzienne przez przyzmat rzeczy*. Toruń: UMK, s. 103-176.

Kurasiński, T. 2004. Dziecko i strzała. Z problematyki wyposożania grobów w militaria na terenie Polski wczesnopiastowskiej (XI—XII wiek). In: *Dusza maluczka, a strata ogromna. Materiały ogólnopolskiej konferencji naukowej Stowarzyczenia naukowego archeologyw Polskich «Funeralia Lednickie. Spotkanie 6». Ostryw Lednicki, Polska, czerwiec 2003*. Poznań: SNAP, s. 131-141.

Kurasiński, T. 2009. Militaria jako element wyposażenia wczesnośredniowiecznych pochówków dziecięcych — próba interpretacji na przykładzie znalezisk z ziem polskich. *Archeologia Polski*, 54, 2, s. 209-248.

Kurasiński, T. 2014. Grotem w dól, grotem w góre. Deponowanie włoczni w grobach wczesnośredniowecznych na ziemiach polskich. *Acta archaeologica Lodziensia*, 60, s. 159-187.

Kurila, L. 2007. Vaiko statusas Rytų Lietuvoje geleţies amžiuje. *Archaeologia Lituana*, 8, p. 97-116.

Lewis, M. E. 2011. The osteology of infancy and childhood: misconceptions and potential. In: Lally, M., Moore, A. (eds.). *(Re)Thinking the Little Ancestor: New Perspectives on the Archaeology of Infancy and Childhood*. Oxford: Archaeopress, p. 1-13.

Profantová, N. 2016a. Social inequality in the Early Middle Ages in Bohemia: written sources and archaeological record. *Tagungen des Landesmuseums für Vorgeschichte Halle*, 13, p. 1-16.

Profantová, N. 2016b. Archeologia elit w IX—X wieku na przykladzie Czech. In: *Tradycje i nowoczesność. Początki państwa polskiego na tle śrydkowoeuropejskim w badaniach interdyscyplinarnych. Materiały międzynarodowej konferencji naukowej. Poznań, Polska, 10—12 czerwca 2015 r.* Poznań: UAM, s. 249-273.

Siemianowska, E. 2008. Wczesnośredniowieczne grzechotki i pisanki w strefie przebiegu szlaku lądowego z Rusi na Pomorze. In: *Kultura materialna średniowieczna w Polsce. Materiały ze studenckiej konferencji naukowej. Toruń, Polska, 24—25 kwietnia 2008 r.* Toruń: UMK, p. 67-84.

Tyszkiewicz, K. 1868. *O kurhanach na Litwie i Rusi Zachodniej: studium archeologiczne*. Berlin: Księgarnia B. Behra.

Vilka, A. 2013. Some aspects of child burials in the Middle and Late Iron Age (5$^{th}$—12$^{th}$ c.) in the territory of Latvia. In: Romanowicz, P. (ed.). *Child and childhood in the light of archaeology*. Wrocław: Chronicon, p. 113-136.

Wawrzeniuk, J. 2004. Symbolika jajka w grobie dziecka w okresie wczesnoredniowiecznym. In: *Dusza maluczka, a strata ogromna. Materiały ogólnopolskiej konferencji naukowej Stowarzyczenia naukowego*

*archeologyw Polskich «Funeralia Lednickie. Spotkanie 6». Ostryw Lednicki, Polska, czerwiec 2003*. Poznań: SNAP, s. 143-154.

Wrzesińska, A., Wrzesiński, J. 2000. Pochówki dzieci we wczesnym średniowieczu na przykładzie cmentarzyska w Dziekanowicach. *Studia Lednickie*, IV, p. 141-160.

## REFERENCES

Alekshin, V. A. 1981. Pogrebalnyi obriad kak arkheologicheskii istochnik. *Kratkie soobshcheniia Instituta arkheologii*, 167, s. 3-8.

Artamonova, O. A. 1963. Mogilnik Sarkela — Beloi Vezhi. *Materialy i issledovaniia po arkheologii SSSR*, 109, s. 26-209.

Zharnov, Iu. E. 1998. Gnezdovskie kurgany s ostatkami trupopolozheniia. In: Ianin, V. L. (ed.). *Istoricheskaia arkheologiia: Traditcii i perspektivy (k 80-letiiu so dnia rozhdeniia D. A. Avdusina)*. Moskva: Pamiatniki istoricheskoi mysli, s. 106-113.

Ivakin, V. G. 2011. Kievskie pogrebeniia X v. *Stratum plus*, 5, s. 243-286.

Lesman, Iu. M. 2014. Skandinavskii komponent drevnerusskoi kultury. *Stratum plus*, 5, s. 43-87.

Makarov, N. A. 1989. Kemskii nekropol v severnom Beloozere. *Kratkie soobshcheniia Instituta arkheologii*, 198, s. 75-83.

Makarov, N. A. 1992. Drevnerusskie amulety-toporiki. *Rossiiskaia arkheologiia*, 2, s. 41-56.

Makarov, N. A., Zaitceva, I. E. 2007. Mininskii arkheologicheskii kompleks: pogrebalnye pamiatniki. In: Makarov, N. A. (ed.). *Arkheologiia severnorusskoi derevni X—XIII vekov: srednevekovye poseleniia i mogilniki na Kubenskom ozere*. I: Poseleniia i mogilniki. Moskva: Nauka, s. 130-184.

Mikhailov, K. A. 2010. Detskie pogrebeniia v nekropole pervykh drevnerusskikh gorodov. *Arkheologicheskie vesti*, 16, s. 151-159.

Mikhailov, K. A. 2016. *Elitarnyi pogrebalnyi obriad Drevnei Rusi: kamernye pogrebeniia IX — nachala XI veka*. Sankt-Peterburg: Branko.

Pushkina, T. A. 2015. Rannegorodskie mogilniki Drevnei Rusi IX—XI vv. (neskolko obshchikh nabliudenii). In: Labutina, I. K. (ed.). *Drevnerusskii nekropol Pskova X — nachala XI veka*. 1: Rannegorodskoi nekropol drevnego Pskova po materialam raskopov na territorii Srednego goroda. Sankt-Peterburg: Nestor-Istoriia, s. 5-25.

Radinsh, A. 2001. Pogrebalnyi obriad i inventar latgalskikh zakhoronenii 10—13 vv. *Archaeologia Lituana*, 2, s. 65-118.

Smirnov, Iu. A. 1997. *Labirint: Morfologiia prednamerennogo pogrebeniia. Issledovanie, teksty, slovar*. Moskva: Vostochnaia literatura.

Fetisov, A. A. 2004. Funktcii strel v pogrebalnom inventare «druzhinnykh kurganov». *Rossiiskaia arkheologiia*, 3, s. 89-98.

Khoruzhaia, M. V. 2015. Detskie pogrebeniia iz katakomb Verkhne-Saltovskogo arkheologicheskogo kompleksa (popytka polovozrastnoi i sotcialnoi interpretatcii). *Drevnosti 2014—2015. Kharkovskii istoriko-arkheologicheskii ezhegodnik*, 13, s. 257-275.

Batey, C., Paterson, C. 2012. A Viking burial at Balnakeil, Sutherland. *Nothern World*, 58, p. 631-659.

Christiansen, E. 2006. *The Norsemen in the Viking Age*. Malden; Oxford; Carlton: Blackwell Publishing.

Drozd, A. 2008. Ozdoby kobiece we wczesnośredniowiecznych grobach z bronią — wyposażenie czy dar? *Acta archaeologica Lodziensia*, 54, s. 51-59.

Gardeła, L., Duma, P. 2013. Untimely death: atypical burials of children in early and late medieval Poland. *World Archaeology*, 45, 2, p. 314-332.

Härke, H. 2014. Grave goods in early medieval burials: messages and meanings. *Mortality*, 19, 1, p. 41-60.

Kucypera, P., Pranke, P., Wadył, S. 2010. Wczesnośredniowieczne miniaturowe toporki metalowe z Europy Środkowo-Wschodniej i Północnej. Korpus zabytków. In: Kucypera, P., Wadył, S. (eds.). *Życie codzienne przez przyzmat rzeczy*. Toruń: UMK, s. 103-176.

Kurasiński, T. 2004. Dziecko i strzała. Z problematyki wyposożania grobów w militaria na terenie Polski wczesnopiastowskiej (XI—XII wiek). In: *Dusza maluczka, a strata ogromna. Materiały ogólnopolskiej konferencji naukowej Stowarzyczenia naukowego archeologyw Polskich «Funeralia Lednickie. Spotkanie 6». Ostryw Lednicki, Polska, czerwiec 2003*. Poznań: SNAP, s. 131-141.

Kurasiński, T. 2009. Militaria jako element wyposażenia wczesnośredniowiecznych pochówków dziecięcych — próba interpretacji na przykładzie znalezisk z ziem polskich. *Archeologia Polski*, 54, 2, s. 209-248.

Kurasiński, T. 2014. Grotem w dól, grotem w góre. Deponowanie włoczni w grobach wczesnośredniowecznych na ziemiach polskich. *Acta archaeologica Lodziensia*, 60, s. 159-187.

Kurila, L. 2007. Vaiko statusas Rytų Lietuvoje geleţies amžiuje. *Archaeologia Lituana*, 8, p. 97-116.

Lewis, M. E. 2011. The osteology of infancy and childhood: misconceptions and potential. In: Lally, M., Moore, A. (eds.). *(Re)Thinking the Little Ancestor: New Perspectives on the Archaeology of Infancy and Childhood*. Oxford: Archaeopress, p. 1-13.

Profantová, N. 2016a. Social inequality in the Early Middle Ages in Bohemia: written sources and archaeological record. *Tagungen des Landesmuseums für Vorgeschichte Halle*, 13, p. 1-16.

Profantová, N. 2016b. Archeologia elit w IX—X wieku na przykladzie Czech. In: *Tradycje i nowoczesność. Początki państwa polskiego na tle śrydkowoeuropejskim w badaniach interdyscyplinarnych. Materiały międzynarodowej konferencji naukowej. Poznań, Polska, 10—12 czerwca 2015 r*. Poznań: UAM, s. 249-273.

Siemianowska, E. 2008. Wczesnośredniowieczne grzechotki i pisanki w strefie przebiegu szlaku lądowego z Rusi na Pomorze. In: *Kultura materialna średniowieczna w Polsce. Materiały ze studenckiej konferencji naukowej. Toruń, Polska, 24—25 kwietnia 2008 r*. Toruń: UMK, p. 67-84.

Tyszkiewicz, K. 1868. *O kurhanach na Litwie i Rusi Zachodniej: studium archeologiczne*. Berlin: Księgarnia B. Behra.

Vilka, A. 2013. Some aspects of child burials in the Middle and Late Iron Age (5th—12th c.) in the territory of Latvia. In: Romanowicz, P. (ed.). *Child and childhood in the light of archaeology*. Wrocław: Chronicon, p. 113-136.

Wawrzeniuk, J. 2004. Symbolika jajka w grobie dziecka w okresie wczesnoredniowiecznym. In: *Dusza maluczka, a strata ogromna. Materiały ogólnopolskiej konferencji naukowej Stowarzyczenia naukowego archeologyw Polskich «Funeralia Lednickie. Spotkanie 6». Ostryw Lednicki, Polska, czerwiec 2003*. Poznań: SNAP, s. 143-154.

Wrzesińska, A., Wrzesiński, J. 2000. Pochówki dzieci we wczesnym średniowieczu na przykładzie cmentarzyska w Dziekanowicach. *Studia Lednickie*, IV, p. 141-160.

*V. A. Makouskaya*

## PROBLEMATIC ISSUES AND PROSPECTS FOR STUDYING CHILDREN'S GRAVE GOODS OF ANCIENT RUS (IN THE CONTEXT OF SYNCHRONOUS EUROPEAN BURIAL GROUNDS)

This paper discusses topical issues and identifies areas of potential future research in the study of children's grave goods in the Rus period. Contentious topics include the presence, or absence of grave goods in children's burials, and their significance in the identification social status, gender, and age of the buried individual. Children's burials from Eastern, Central, and a Western Europe are cited as examples and analogies. The paper establishes that the presence of burial goods depended on the aspects of the culture's funeral rite,

the age of the buried child and the social status of his/her family. Correlation with parental social status is viewed through the inclusion of weaponry in the grave goods assemblage, particularly for young children. The types of weaponry considered in the study includes axes, arrows, spears, javelins and battle knifes from children's burials in Central and Eastern Europe. Axes are most the common finds in Rus children's graves with weapons, whereas swords and protective armaments are unknown in Rus children's burials. Comparison with neighboring Slavic territories showed that the minimum age threshold for Rus children's burials with weapons is higher — 6 years.

Potential area of further research into the Rus children's burials with weapons is the correlation between the age of the buried child, the type of weapons included in the burial and the geographical location of the burial. Female jewelry and household items, including temple rings and beads, are occasionally found in children's burials with grave goods typical of male graves. Such items may be indicative of the buried person dying before reaching social adulthood. Items that may be identified as age markers among the assemblages of children's grave goods include amulets in the shape of miniature axes, gaming dice from astragali and painted ceramic eggs with ceramic ball inside («pisanki»). These objects are predominantly found in cemeteries with high status Rus burials. The research efforts needs to be directed to the identification of marker artifacts for child burials in rural cemeteries, as well as the identification of female child burials.

**Keywords:** archaeology of childhood, Early Middle Ages, Ancient Rus, children burials, grave goods.

*В. О. Маковська*

## ПРОБЛЕМНІ ПИТАННЯ ТА ПЕРСПЕКТИВИ ВИВЧЕННЯ ДИТЯЧОГО ПОХОВАЛЬНОГО ІНВЕНТАРЮ ДАВНЬОЇ РУСІ (В КОНТЕКСТІ СИНХРОННИХ ЄВРОПЕЙСЬКИХ МОГИЛЬНИКІВ)

Статтю присвячено спробі визначити деякі проблемні питання та актуальні напрями вивчення дитячого похованого інвентарю в давньоруський період. Розглянуто такі аспекти як наявність або відсутність інвентарю в дитячих похованнях, його соціальне, гендерне та вікове значення. В якості прикладів й аналогій наведено дитячі поховання Східної та Центральної Європи, а також з деяких добре досліджених областей Західної Європи. Можна сказати, що наявність поховального інвентарю залежала, в першу чергу від поховального обряду, прийнятого в культурі, а також багато в чому від віку похованої дитини та соціального статусу сім'ї. Зброя в дитячих похованнях, в більшості випадків, також була ознакою соціального статусу сім'ї. Це твердження особливо актуально для маленьких дітей. З предметів озброєння в дитячих похованнях Центральної та Східної Європи найчастіше зустрічаються сокири, стріли, списи і дротики, бойові ножі. В давньоруських дитячих похованнях з предметів озброєння найбільш часто зустрічаються сокири, в той час як мечі й предмети захисного обладунку в дитячих похованнях на території Давньої Русі невідомі. В порівнянні з сусідніми слов'янськими територіями, можна сказати, що мінімальний віковий поріг для давньоруських дитячих поховань зі зброєю найвищий - 6 років. Перспективним напрямком досліджень давньоруських дитячих поховань зі зброєю є виявлення кореляції між віком похованої дитини, видом озброєння та географією поховання. Жіночі прикраси (скроневі кільця й буси) та жіночі предмети домашнього побуту іноді зустрічаються в дитячих похованнях з типово чоловічим інвентарем. Такі предмети, вірогідно, вказують на те, що похований помер не досягнувши віку дорослої людини. Серед предметів дитячої матеріальної культури, які можуть претендувати на роль вікових маркерів для дитячих поховань Давньої Русі, можна назвати сокири-амулети, астрагали та яйця-писанки. Ці предмети знаходять здебільшого на могильниках з похованнями еліти давньоруського суспільства. Водночас, перспективним завданням є визначення маркерних артефактів для поховань дітей з сільських могильників. Окрім того, перспективним напрямком досліджень є також пошук артефактів, які могли б маркувати поховання дівчат.

**Ключові слова**: археологія дитинства, раннє Середньовіччя, Давня Русь, дитячі поховання, поховальний інвентар.

*Одержано 7.12.2020*

**МАКОВСЬКА Вікторія Олександрівна**, аспірант, Білоруський державний університет, науковий співробітник, Білоруський державний музей народної архітектури та побуту, Мінськ, Республіка Білорусь.

**MAKOUSKAYA Viktoryia**, Ph. D. student, Belarusian State University, Researcher, the Belarusian State Museum of Folk Architecture and Rural Lifestyle, Minsk, Republic of Belarus.

ORCID: 0000-0002-2408-0637, e-mail: makouskayav@gmail.com.